# Тэма 6. БІЯСФЕРА



**Геаграфічныя рэкорды**

- *Самая вялікая жывёла сушы — афрыканскі слон (да 7,5 т, Афрыка).*
- *Самая вялікая жывёла — сіні кіт (да 33 м, 180 т).*
- *Самая маленькая птушка — калібры (меньш за 2 г, Пд. Амерыка).*
- *Самая высакагорная жывёла — як (да вышыні 6100 м, Азія).*
- *Самая глыбакаводная рыба — пеліканападобная камбала (да глыбіні 10 917 м).*
- *Самая доўгая расліна — ратангавая пальма (да 300 м, Азія).*
- *Самае вялікае дрэва — секвоя гіганцкая (110 м, Пн. Амерыка).*
- *Самы вялікі каралавы рыф — Вялікі Бар'ерны рыф (2300 км, Ціхі акіян).*

## § 29. Будова біясферы. Глеба

**Успамінаем.** *Чым адрозніваецца жывая прырода ад нежывой? Якія цеплавыя паясы вылучаюць на зямным шары?*

**Даведаемся.** *Што такое біясфера і дзе яе межы. Якая роля жывых арганізмаў у біясферы. Як фарміруюцца глебы і якія яны бываюць.*

**Разважаем.** *Якая з абалонак Зямлі самая маладая?*

**1. Біясфера і яе межы.** Наша планета ўтварылася каля 4,6 млрд гадоў таму. Жыццё на Зямлі ўзнікла не пазней за 3,8 млрд гадоў таму. Жывыя арганізмы развіваліся і рассяляліся па планеце. У выніку яны асвоілі і пераўтварылі ўсе абалонкі Зямлі.

Правообладатель Народная асвета

**Біясфера** — адмысловая абалонка Зямлі, якая заселена і пераўтворана жывымі арганізмамі.




Мал. 120. Межы біясферы

Біясфера (ад грэч. *біяс* — жыццё, *сфера* — шар) — абалонка жыцця. У яе ўключаны не толькі самі жывыя арганізмы, але і асяроддзе іх пражывання: уся гідрасфера, верхняя частка літасферы і ніжняя частка атмасферы (мал. 120). Верхняя мяжа біясферы праводзіцца па азонавым слоі, які ахоўвае жывыя арганізмы ад ультрафіялетавага выпраменьвання. За ніжнюю мяжу прымаюць верхні слой зямной кары да глыбіні 3—4 км на сушы і 1—2 км на дне акіянаў. Такім чынам, біясфера — тонкая абалонка таўшчынёй да 30—40 км.

Большасць жывых арганізмаў жыве на мяжы розных асяроддзяў — вады і сушы, сушы і паветра, паветра і вады. Менавіта тут фарміруюцца найбольш спрыяльныя ўмовы для жыцця: дастаткова святла, цеплыні, вільгаці і пажыўных рэчываў.

Правообладатель Народная асвета

**2. Разнастайнасць і роля жывых арганізмаў у біясферы.** Жывыя арганізмы вельмі разнастайныя. Карыстаючыся малюнкам 121, успомніце з навучальнага прадмета «Біялогія», на якія царствы яны дзеляцца.




Мал. 121. Царствы жывой прыроды

З моманту свайго з'яўлення жывыя арганізмы ўплываюць на ўсе абалонкі планеты. Расліны ўзбагачаюць атмасферу кіслародам. Менавіта яны зрабілі яе прыдатнай для жыцця іншых арганізмаў. Зялёныя расліны на святле выpабляюць арганічнае рэчыва, якое ў сваю чаргу спажываецца жывёламі.

Расліны — найважнейшае звяно ў кругавароце вады. Яны паглынаюць з атмасферы і выпараюць велізарную колькасць вільгаці. З адмерлых рэшткаў раслін і жывёл утвараюцца ападкавыя горныя пароды. *(Прывядзіце прыклады.)* Біясфера — асяроддзе жыцця чалавека. Але чалавецтва імкліва знішчае біялагічныя рэсурсы (мал. 122). Незаменная роля жывых арганізмаў ва ўтварэнні глебы.




Мал. 122. Віды жывёл, якія зніклі:
*а)* вандроўны голуб, *б)* тур, *в)* дронт, *г)* марская карова

Правообладатель Народная асвета